УДК 008(476)

# УЗАЕМАСУВЯЗІ БЕЛАРУСКАЙ І СКАНДЫНАЎСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў IX-XI стст

***Юрий Бородин***
*Национальная библиотека Беларуси*
yurij.kolizej@mail.ru

У артыкуле разглядаюцца культурныя сувязі паміж Скандынавіяй і землямі сучаснай Беларусі ў эпоху вікінгаў.

***Ключавыя словы: вікінгі, скандынаска-беларускія сувязі, сярэднявечча***

# RELATIONSHIPS BETWEEN BELARUSIAN AND SCANDINAVIAN CULTURE IN THE IX-XI CENTURIES

***Yrij Borodin***
*National Library of Belarus*

The article examines the cultural ties between Scandinavia and the lands of modern Belarus in the Viking Age.

***Keywords: Vikings, Scandinavian-Belarusian relations, the Middle Ages***

Міфалогія як частка і з’ява духоўнай матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў і скандынаваў. У беларускай і скандынаўскай міфалогіі раскрываюцца, падзеі і гісторыя, якія адбываліся з IX ст., калі ў беларускага і скандынаўскіх народаў была старажытная вера – язычніцтва. Шматбожжа і пантэон язычніцкіх багоў як частка духоўнай культуры беларусаў і скандынаваў.

Калі вікінгі ў IX ст. дайшлі на сваіх дракарах да славян, таксама і на тэрыторыю Беларусі, яны пакінулі пасля сябе спадчыну і гістарычную памяць. Напрыклад, у ва многіх гарадах і вёсках Беларусі былі праведзеныя археалагічныя раскопкі, дзякуючы якім былі знойдзеныя пакінутыя пасля вікінгаў іх зброя, прадметы, адзенні. Такім чынам, вікінгі пакінулі сляды ўласнай матэрыяльнай культуры ў беларусаў. Нягледзячы на тое, што паміж славянскімі княствамі адбываліся ваенныя канфлікты, у якіх удзельнічалі скандынаўскія вікінгі, частка якіх змагалася на баку наўгародскага і будучага кіеўскага князя Ўладзіміра і супраць Полацка, дзякуючы полацкаму князю Рагвалоду і яго дачцэ Рагнедзе, якія мелі скандынаўскія імёны, і прыйшлі з Нарвегіі, быў пакладзены працяг беларуска-скандынаўскіх сувязяў. Акрамя вікінгаў з Нарвегіі, на тэрыторыі Беларусі пакінулі свой гістарычны след шведскія вікінгі, і асабліва, у Полацк, пры Рагвалодавых нашчадках, здзяйснялі візіт вікінгі з Ісландыі.

У адрозненне ад Захаду, які ў час вікінгаў вылучаўся выключна хрысціянствам, з якім вікінгі заўсёды былі ў канфлікце, калі здзяйснялі набегі на каралеўствы Англіі, Франкіі, і г.д., ва Ўсходзе вікінгі знайшлі агульнае паразуменне з славянамі. А менавіта, падабенства і функцыі язычніцкіх багоў, у якіх яны верылі.

Хрысціянізацыя не падарвала культурныя стасункі скандынаваў з беларусамі. І нават прыняўшы афіцыйна хрышчэнне, беларускі і скандынаўскія народы захавалі павагу да язычніцтва.

**Мэтай** даследавання з’яўляецца разуменне ўзаемасувязяў беларускай і скандынаўскай культуры ў параўнальнай міфалогіі, у міфалагічнай свядомасці і агульнай гісторыі беларусаў і скандынаваў.

**Задачы**:

- Паказаць гісторыка-культурную спадчыну, якую пасля сябе пакінулі вікінгі на тэрыторыі Беларусі;
- Раскрыць сувязі Рагвалода і яго нашчадкаў са Скандынавіяй ;

– Параўнаць гісторыю і культуру беларусаў і скандынаваў;

**Аб'ект даследавання** – беларуская і скандынаўская культура.

**Прадмет даследавання** – уплыў скандынаўскай культуры на беларускую ў IX-XI стст.

У даўнія часы, з IX ст. пачаліся цесныя, гандлёвыя і культурныя сувязі паміж Беларуссю і Скандынавіяй. Вікінгі, акрамя таго, што здзяйснялі паходы, набегі і заваёвы іншых зямель і тэрыторый, яны займаліся падарожжам і адкрыццём новых зямель. Іх караблі дасягнулі тэрыторыі Беларусі, а менавіта, вёскі Масковічы Віцебскай вобласці, Браслаўскіх азёраў, ракі Нёман, Прыпяці, Сожа, Панямоння, Падняпроўя, Дняпра, Цэнтральнай Беларусі, а таксама Полацкага княства.

Вікінгі, якія перасяляліся з Скандынавіі на тэрыторыю Беларусі, а таксама Кіева, і ўсёй Усходняй Еўропы, зваліся «варагамі» [3,226]. А зямля, дзе пражывалі славяне, звалася «Руссю». «Русь» у значэнні саманазвы з'явілася ў выніку змяшанага насельніцтва, дзе славяне ўступалі ў кантакт са скандынавамі.

Паміж беларусамі і скандынавамі ёсць агульныя рысы: і тыя, і другія адчувалі сябе нашчадкамі багоў. Вікінгі называлі сябе «сынамі Одзіна» - бога вайны, Усебацькі скандынаўскіх багоў, беларусы – унукамі Дажбога – бога сонца.

Таксама, у беларусаў і вікінгаў падобныя функцыі багоў: бог грому (Тор, Пярун), бог сонца (Фрэйр, Дажбог), бог-каваль (Сварог, Вёлунд), багіня любові (Фрэйя, Лада), бог вайны (Одзін, Пярун), бог вясны (Бальдр, Ярыла), бог зімы (Улль, Зюзя), бог ветру (Ньёрд, Стрыбог), бог агню (Локі, Сварог), і г.д.

Пад назвай «Шлях з вараг ў грэкі» з IX-XI стст. адчуваюцца агульныя ўзамасувязі беларускай і скандынаўскай культуры. Умацаванне гістарычных і культурных сувязяў паміж Беларуссю і Скандынавіяй актыўна працягваецца ў X ст., калі ў 960 г. уладу ў Полацкім княстве атрымаў Рагвалод – сын нарвежскага конунга Эрыка крывавая сякера і Гунхільд, брат нарвежскага караля Эрыка Шэрая Скура і Гудраты.

Паколькі, імёны «Рагвалод» і «Рагнеда» маюць скандынаўскае паходжанне, полацкі князь і яго дачка маюць дачыненне як да беларускай, так і да скандынаўскай культуры. Намаганнямі Рагвалода ўмацавалася незалежнасць і дзяржаўнасць полацкага княства ва ўсходнеславянскіх землях. Разам з Турам - першым князем Тураўскага княства, Рагвалоду належыць пачатак заснавання дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі. Тур, будучы пляменнікам нарвежскага конунга – Б'ёрна Марахода, так жа, як і Рагвалод, належыць да скандынаўскай дынастыі Інгінгаў. Праз Полацк і Тураў праводзіліся са Скандынавіяй культурныя сувязі, а таксама гандаль.

Вікінгі на тэрыторыі Беларусі стварылі базы для гандлю і вайсковыя дружыны. Захавалася шмат курганаў з пахаванымі ў іх скандынаўскімі вікінгамі разам з мячамі і сякерамі, якімі карысталіся выхадцы са Скандынавіі, а таксама пярсцёнкамі і адзеннем, у якое апраналіся скандынавы.

Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі правёў даследаванні па гісторыі і археалогіі, а таксама былі праведзеныя раскопкі, падчас якіх была знойдзена зброя і месцы пахавання вікінгаў на тэрыторыі Беларусі.

У выданні да адкрыцця выставы «Вікінгі на Ўсходзе» пад аўтарствам Сяргея Дзмітравіча Дзярновіча – сумеснага праекту Дзяржаўнага гістарычнага музея Швецыі, Швецкага інстытута, Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі каталог уключае скандынаўскія артэфакты X-XI стст. [1, с. 3].

Атрыбутам скандынаўскіх вікінгаў з'яўляліся прадметы для ўзбраення, якія захаваліся па сённяшні дзень у Беларусі: мячы, вострыя наканечнікі дзідаў (знойдзеныя на гарадзішчы Кульбачына Шчучынскага раёна); дзіда падоўжана-трохвугольнай формы (з пахавання каля вёскі Лукомль Чашніцкага раёна); мастацкія творы паўночных ювеліраў; грыўні (са скарбу сярэдзіны IX ст., знойдзенага каля вёскі Парэчча Глыбокскага раёна); лодкападобныя бранзалеты (X ст., Віцебск) [6, с. 83].

У канцы 1970 – пачатку 1980-х гг. на тэрыторыі Беларусі былі таксама знойдзены косткі жывёл са скандынаўскімі рунічнымі надпісамі XII – XIII стст. Усе гэтыя прадметы – гістарычны доказ узаемадзеяння паміж беларускай і скандынаўскай культурамі.

Таксама, неабходна адзначыць, што некаторыя скандынаўскія ваяры прымалі ўдзел у міжусобных войнах [2,с.137], як напрыклад паміж князем Уладзімірам Чырвонае Сонейка, іягоным братам Яраполкам, забітым ім. Многія з іх прымалі ўдзел у захопе полацкага княства, якое абаранялі Рагвалод і яго сыны. Скандынаўскіх вікінгаў працягвалі наймаць нашчадкі Рагвалода – дынастыя Рагвалодавічаў. Полацкі князь Брачыслаў Ізяславіч выкарыстоўваў атрад нарвежскіх ярлаў Эймунда Рынгсана і Рагнара Агнарсана для паходу на Ноўгарад у 1021 г. [2,с.139]. У якасці вартаўнікоў і дадатковай абароны былі таксама скандынавы на баку полацкага князя Усяслава Брачыслававіча з мянушкай «Чарадзей».

Пасля афіцыйнага прыняцця хрысціянства ўзаемасувязі паміж беларускай і скандыўскай культурамі не знікаюць, а ўмацоўваюцца. Напрыклад, дацкі конунг Вальдэмар Вялікі ажаніўся з дачкой менскага і полацкага князя Валадара (сына менскага князя Глеба) – Соф'яй Менскай.

У беларускай праваслаўнай царкве ўшаноўваюцца скандынаўскія святыя - Кнут і Магнус. Шведскі біскуп Магнус стаў арцыбіскупам у праваслаўнай царкве ў Полацку. У дацкім Калубродзе ў XII ст. быў пабудаваны касцёл, які наследаваў полацкі Сафійскі сабор.

Шматвяковыя адносіны паміж беларусамі і скандынавамі прывялі да глыбокага паразумення іх духоўнай і матэрыяльнай культуры, і да культурнага адзінства [3,с.224].

Нягледзячы на прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства ў канцы X ст. у славян і скандынаваў, беларусы і вікінгі таксама адыгралі значную ролю ў захаванні старажытнай язычніцкай веры сваіх продкаў. Калі ў Кіеве і ў іншых славянскіх княствах, як у Нарвегіі, Швецыі і Даніі адбывалася хрышчэнне шляхам выцяснення язычніцтва, то з славянскіх народаў беларусы, а з скандынаўскіх ісландцы паспрыялі захаванню язычніцтва. У Скандынавіі захавалася прадстаўленне аб язычніцтве вікінгаў дзякуючы старажытна-ісландскім помнікам скандынаўскай культуры «Старэйшая Эда» пад аўтарствам ісландскага пісьменніка і вучонага Сэмунда Мудрага «Малодшая Эда», якую напісаў ісландскі скальд (паэт) Сноры Стурлусан. У 2021 г. Беларусь пабачылі пераклады Яўгена Папакуля «Старэйшай Эды»[4] і «Малодшай Эды»[5] на беларускую мову.


1. Казанцава, М.В. Вікінгі на Ўсходзе / М.В. Казанцава. – Мн.:Юніпак, 2002. – 16 с.: іл.
2. Ласкавый, Г.В. Викинги. – МФЦП, 2004. – 320 с.
3. Лебедев, Г.С. Эпоха викингов в Северной Европе. – Ленинград Издательство Ленинградского университета, 1985. – 286 с.
4. Папакуль, Я. Эда. Песні пра багоў. – Мінск: Галіяфы, 2021. – 312 с.
5. Папакуль, Я. Эда Сноры Стурлусана. – Мінск: Галіяфы, 2021. – 298 с.
6. Труды молодых специалистов Полоцкого Государственного Университета. – Новополоцк: ГПУ, 2007. – 144 с.


.